✓**З 19 кастрычніка ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі** працуе выстава **«Кніжныя скарбы Куцеінскага манастыра»**, прымеркаваная да 400-годдзя з дня заснавання Куцеінскага Богаяўленскага манастыра, аднаго з самых старажытных праваслаўных манастыроў нашай краіны. У 1623 г. Багдан Статкевіч надаў фундуш на будаўніцтва праваслаўнага манастыра Богаяўлення каля Оршы. Куцеінская друкарня працавала пры манастыры ў 1630 – 1654 гг. У манастырскай друкарні выдавалася навукова-асветніцкая, царкоўна-палемічная і свецкая літаратура на царкоўнаславянскай і старабеларускай мовах. Яе выданні вылучаліся своеасаблівым графічным афармленнем.

Выстава знаёміць са старонкамі гісторыі манастыра, а таксама з выданнямі манастырскай друкарні і кнігамі з манастырскай бібліятэкі. Са збораў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі экспануюцца рукапісны помнік –

Сінодзік Куцеінскага манастыра XVIII ст., узор перакладной літаратуры «Казанне пра Варлаама і Іасафа» (1637), «Брашна духоўнае» (1639), «Актоіх» Іаана Дамаскіна (1646), Новы Запавет з Псалтыром (1652), адно з прыгажэйшых богаслужэбных выданняў «Трыфалагіён» (1647) і «Лексікон...» Памвы Бярынды (1653). Таксама ўвазе зацікаўленых прадстаўлены шэраг кірылічных выданняў і рукапісаў XVII – XVIII стст. з запісамі Куцеінскага манастыра. Сярод іх рукапісны нотны Ірмалогій XVII ст., еўеўскае выданне Евангелля вучыцельнага 1616 г., маскоўскія і кіеўскія богаслужэбныя старадрукі.

Выстава будзе працаваць да 30 лістапада.

